котором свойственна открытость финала. Наблюдается языковая разностильность, дискретность языка публикаций, расширение лексики за счет сленговых новообразований. Свойство «открытости» на уровне текста в *Esquire* приводит к появлению особого комплекса, в котором взаимодействие автора публикации и аудитории направлено на диалог, на обмен актуальной информацией.

Контент издания демонстрирует размывание типологических границ мужского глянца и тяготение к общественно-политической и публицистической направленности, к трансляции современного стиля жизни. Таким образом, *Esquire* присуща дискретность – издание объединяет в себе общественно-политический, литературно-публицистический, мужской, стилевой и культурно-развлекательный типы изданий, что позволяет выделить глянцевый журнал *Esquire* в синтетический тип издания, находящийся в стадии активного развития. Не исключено, что, следуя синергетическому свойству открытости и неравновесности системы, со временем издание приобретет ряд дополнительных черт, которые позволят идентифицировать журнал иначе.

*Литература*

1. Головин, Ю. А. Российские литературно-художественные журналы в системе культурной политики: содействие, компромисс, противостояние: автореф. дис. ... д-ра культурологии / Ю. А. Головин. – М., 2010. – 46 с.
2. 10 фактов о журнале «Esquire» // Factroom [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.factroom.ru/facts/560. – Дата доступа: 14.02.2016.
3. Свитич, Л. Г. Феномен журнализма / Л. Г. Свитич. – М.: Факультет журналистики МГУ, 2000. – 252 с.
4. Стихи и поза // Esquire. – 2013. – 4 октября. – № 92 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://esquire.ru/fashion/gonjasufi. – Дата доступа: 29.01.2016.

**Уладзімір Касько**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ПРЫВАТНЫЯ ВЫДАВЕЦТВЫ БЕЛАРУСІ

Кнігавыдавецкая справа на Беларусі пачыналася з дзейнасці Францыска Скарыны – аднаго з першых асветнікаў Усходняй Еўропы. Ён добра разумеў вялікую гістарычную місію друкаванай кнігі як магутнага сродку культурнага прагрэсу чалавецтва і верыў, што яна патрэбна на-

роду не менш, чым хлеб. Сын полацкага купца аддаў усе свае сілы, веды і энергію той вялікай справе, у якой бачыў галоўны сэнс свайго жыцця – перакладу Бібліі на родную мову і заснаванню ўсходнеславянскага кнігадрукавання. 6 жніўня 1517 года з друкарскага станка сышла першая кніга «Псалтыр», за кароткі час ён падрыхтаваў і выдаў на працягу 1517–1519 гадоў у чэшскай Празе 23 кнігі Біблііі.

Пераемнікам выдавецкіх традыцый на Беларусі ў XVI–XVII стст. было брацкае кнігадрукаванне, станаўленне якога арганічна звязана з фарміраваннем і развіццём спецыфічных нацыянальна-рэлігійных арганізацый праваслаўнага насельніцтва. Дзякуючы ім былі надрукаваны і выпушчаны граматычныя і лексікаграфічныя выданні: «Граматыка славянская» Лаўрэнція Зізанія (1596), «Граматыка славенская» Мялеція Сматрыцкага (1619), «Лексікон славянароскі» Памвы Бярынды (1653). З 1590-х гг. да 1654 г. беларускія друкарні выпусцілі 16 буквароў – больш за палову ўсіх аналагічных выданняў на ўсходнеславянскіх землях. Працягваючы традыцыі Скарыны, брацкія выдаўцы заклалі моцны падмурак беларускай школы выдавецкай дзейнасці.

Беларусь да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі з'яўлялася адной з адсталых ускраін Расійскай імперыі, дзе ні газет, ні выдавецтваў, ні школ на роднай мове не было. У 1914 годзе на 6420 чалавек прыходзілася адна бібліятэка. Беларуская кніга у іх была надзвычай рэдкай з'явай.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі працавалі 11 друкарняў са штатам 284 чалавекі. Гэта былі прымітыўныя кустарныя прадпрыемствы.

У жніўні 1917 г. ствараецца выдавецтва «Звязда». У большасці яно выпускала бальшавіцкую літаратуру, а пасля рэвалюцыі – працы Леніна, брашуры пад рубрыкай «Бібліятэка пралетарыя». Тут жа друкаваліся і газеты.

У 1918 г. пры Белнацкаме (Беларускі аддзел камісарыята па справах нацыянальнасцей камуністаў Паўночнай вобласці) ствараецца выдавецкі аддзел, які узначаліў З. Жылуновіч – Цішка Гартны. Ён выпускаў бальшавіцкую літаратуру, газету «Дзянніца», кнігі, брашуры, пракламацыі. У канцы 1918 г. былі здадзены ў набор другі зборнік твораў беларускіх пісьменнікаў «Жніво», зборнік твораў Гартнага. У 1921 г. ствараецца Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі і орган цэнтралізацыі друкарскай справы – Дзяржвыдат.

У 1922 г. адкрываюцца выдавецтвы – «Вперед», «Адраджэнне», «Савецкая Беларусь». Асаблівая ўвага надаецца выпуску падручнікаў на беларускай мове.

Складаны шлях прайшло выдавецтва «Беларусь». Заснаванае ў лістападзе 1920 г. як беларускае аддзяленне Дзяржвыдавецтва РСФСР, са студзеня 1921 г. яно становіцца Дзяржвыдавецтвам БССР. У першыя гады акрамя кніг выпускала газеты і часопісы. У снежні 1922 г. увайшло ў склад Белтрэстдруку (Дзяржаўны трэст выдавецкай справы і паліграфічнай прамысловасці Беларусі). У чэрвені 1924 г. «Белтрэстдрук» і кааператыўнае выдавецтва «Савецкая Беларусь» былі рэарганізаваны. На іх базе ствараецца Беларускае дзяржаўнае выдавецтва БССР. У час вайны з 1942 г. яно працавала ў Маскве і называлася «Савецкая Беларусь», а ў снежні 1943 г. было зноў перайменавана ў Дзяржаўнае выдавецтва БССР. У 1944 г. аднавіла дзейнасць у Мінску. У 1963 г. атрымала назву «Беларусь». Сёння гэта адно з вядучых дзяржаўных выдавецтваў краіны, якое выпускае афіцыйную, навуковую, навукова-папулярную, вытворча-практычную, вучэбную, масава-палітычную, літаратурна-мастацкую, даведачную, рэкламную літаратуру, фотаальбомы, кнігі па дамаводстве і г. д.

На 1 студзеня 2016 г. у нашай краіне зарэгістравана 485 суб’ектаў гаспадарання: у тым ліку 181 суб’ект гаспадарання дзяржаўнай формы ўласнасці, 231 – прыватнай формы ўласнасці, 44 індывідуальныя прадпрымальнікі, 19 рэлігійных арганізацый і 10 грамадскіх аб’яднанняў.

У 2015 г. яны выпусцілі 10 273 назвы кніг і брашур агульным тыражом 21,55 млн экзэмпляраў. На аднаго жыхара прыходзіцца 2,3 экз. выданняў. Сярэдні аб’ём аднаго выдання склаў 3,5 выдавецкага аркуша, сярэдні тыраж – 2,1 тыс. экз. На беларускай мове выпушчана 1168 назваў кніг і брашур тыражом 3,68 млн экз.

81 выдавецтва і выдавецкія арганізацыі выпусцілі ад 11 да 50 назваў, 37 – ад 51 да 100, 21 арганізацыя – ад 101 да 200 назваў. У асноўным гэта выдавецкія цэнтры ВНУ, а таксама выдавецтва «Народная асвета», выдавецкі дом «Беларуская навука». Нарошчваюць выпуск літаратуры прыватныя арганізацыі «Кніжны дом», «Аверсэв», «Белы вецер». Вопыт работы апошніх заслугоўвае ўвагі не толькі недзяржаўных, але і дзяржаўных выдавецтваў.

«Міжнародны кніжны дом» – адно з найстарэйшых прыватных выдавецтваў, якое апошняе дзесяцігоддзе нязменна ўваходзіць у дзясятку найбуйнейшых выдавецтваў Беларусі. Заснавана ў 1994 г. як закрытае акцыянернае таварыства, пазней было рэарганізавана ў выдавецкае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства. Яго заснавальнікам і дырэктарам-выдаўцом з’яўляецца вядомы навуковец і выдавец С. Кузьмін.

«Кніжны дом» штогод выпускае ад 200 да 300 назваў рознай кніжнай прадукцыі агульным тыражом каля шасці мільёнаў экзэмпляраў. Перавага аддаецца вучэбнай, навуковай, навукова-папулярнай, даведачнай, дзіцячай, мастацкай літаратуры. З 2000 года выпускае прадукцыю выключна па заказе беларускіх кнігагандлёвых арганізацый і фірм. Галоўнай задачай выдавецтва з'яўляецца выпуск высакаякаснай, багата ілюстраванай і ў той жа час даволі таннай кніжнай прадукцыі. Добрую рэпутацыю заваявалі шматлікія энцыклапедычныя і даведачныя выданні: «Новейший философский словарь» (перавыдаваўся тройчы), фундаментальныя філасофскія энцыклапедыі – «Постмодернизм», «История философии», «Социология», «Эзотеризм», «Религия», «Психоанализ». Універсальная медыцынская энцыклапедыя В. Улашчыка «Лекарственные растения» перавыдывалася ажно 9 разоў. Сярод папулярных даведачных выданняў варта назваць «Здоровое питание», «Ваш ребенок от рождения до школы», «Большой домашний медицинский справочник», «Мать и дитя», «Самооздоровление» С. Зайцава, «Народная медицина» А. Добрава, «Дом, коттедж, дача» В. Сафроненкі.

Высокую ацэнку навукоўцаў, студэнтаў атрымалі даведачнае выданне Б. Плотнікава і Л. Антанюк «Беларуская мова: лінгвістычны кампендыум» і «История Беларуси с древности до наших дней» П. Чыгрынава.

Выдавецтва надрукавала звыш 100 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для вышэйшых і сярэдніх устаноў адукацыі па эканоміцы, медыцыне. У серыях «Помощь школьнику», «Репетитор», «Школьный курс» і інш. убачылі свет каля 80 вучэбна-метадычных выданняў.

Шматлікія навуковыя, навукова-папулярныя выданні выходзяць у серыях «Рэлігія свету», «Мысліцелі XX стагоддзя», «Тайны посвященных», «Дамашні даведнік», «Здароўе вашай сям'і», «Папулярная бібліятэчка».

Прыярытэтным напрамкам «Кніжнага дома» з'яўляецца выпуск класічнай літаратуры, выданняў сучасных пісьменнікаў і паэтаў. Варта прыпомніць саракатомнае выданне А. Крысці, раманы С. Зайцава, Я. Крымава, В. Паўлава, Т. Кавалёвай і многіх іншых, якія пастаянна папаўняюць серыі «Сучасны дэтэктыў», «Любоўны раман», «Гісторыя Расіі ў раманах».

Значнае месца ў тэматычных планах адведзена дзіцячым кнігам. У серыях «Любімыя казкі малышоў», «Кроха», «Краіна цудаў», «Казачная хацінка», «Вялікія казачнікі свету», «Матылёк: вершы маленькім» друкуюцца творы А. Пушкіна, В. Гаўфа, братоў Грым, Х. К. Андэрсэна, нашых сучаснікаў. Іх папулярнасці ў многім садзейнічае праца мастакоў І. і У. Пуставалых, В. Чуйко, П. Арлоўскага, А. Ткачука.

Каля 470 назваў тыражом 4,44 млн экз. выпусціла ў 2015 г. выдавецка-гандлёвае прадпрыемства «Аверсэв». Асноўны напрамак яго дзейнасці – вучэбна-метадычная літаратура, якая адрасуецца выкладчыкам агульнаадукацыйных школ, ліцэяў, гімназій, прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных устаноў, а таксама абітурыентам, студэнтам і выкладчыкам вышэйшых навучальных устаноў. Выпушчаныя за 22 гады з дня заснавання выдавецтва кнігі – вынік плённай працы аўтараў – вядомых педагогаў, дызайнераў, мастакоў-афарміцеляў, высокапрафесійных супрацоўнікаў «Аверсэва». Каля 1000 назваў дапаможнікаў з маркай выдавецтва можна ўбачыць на прылаўках кнігарняў рэспублікі. Для школьнікаў – гэта серыі «Разумныя кнігі для самых маленькіх», «Гаворачы аловак», «Логіка для дашкольнікаў». Для навучэнцаў пачатковай школы – звыш 200 дапаможнікаў, якія складзены ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай. З іх дапамогай настаўнікі могуць развіваць кругагляд сваіх дзяцей, правяраць іх веды.

Пры падрыхтоўцы лабараторных і практычных работ школьнікам дапамогуць спецыяльныя сшыткі, настаўнікам – дыдактычны матэрыял і тэсты. Большасць кніг прайшлі рэцэнзаванне, многія з іх маюць грыф «Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь”». На міжнародных і прадстаўнічых выставах і конкурсах «Аверсэв» часта адзначаецца самымі прэстыжнымі ўзнагародамі.

Выдавецтва «Чатыры чвэрці» заснавана ў 1992 г. Асноўнай мэтай яго стварэння было запаўненне прабелу ў падрыхтоўцы і выданні нотна-музычнай літаратуры. Аднак практычна з першых гадоў існавання сфера выдавецкіх інтарэсаў значна пашырылася – распрацоўваліся праекты па аўтэнтычнай духоўнай і фізічнай культуры. За гады існавання выйшла мноства кніг самых разнастайных напрамкаў: вучэбныя, навукова-папулярныя, літаратурна-мастацкія, даведачныя, рэкламныя. Карыстаюцца поспехам нотныя, паэтычныя зборнікі, манаграфіі, школьныя фотаальбомы і альбомы жывапісу з грунтоўнымі каментарыямі. Многія з іх адзначаны граматамі конкурсу «Мастацтва кнігі».

У 1993 г. убачыла свет серыя навукова-папулярных кніг-альбомаў «Нашы духоўныя каштоўнасці». Іх ідэя – простай, зразумелай мовай распавядаць аб хрысціянскіх ісцінах, папаўняць веды людзей пра айчынныя святыні, быць правадніком хрысціянскай веры. У шэрагу іх – унікальны альбом «Веткаўская ікона», які зрабіў бы гонар выдавецтву любой дзяржавы. Аўтар тэксту – дырэктар Веткаўскага музея Г. Нячае-

ва. Упершыню ў краіне старасавецкія абразы прадсталі перад сённяшнім пакаленнем ва ўсёй іх гістарычнай значнасці і самабытнасці.

З кожным годам нарошчвае выпуск кніг і брашур «Выдавецкі дом “Белы вецер”». У агульным аб’ёме прадукцыя названых вышэй прадпрыемстваў складае звыш 10 % па колькасці назваў і каля 27 % па сумарным тыражы. Сур’ёзны ўнёсак у кніжную скарбонку Беларусі.

**Алена Кунахавец-Плявака**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## САВЕЦКАЯ СПАДЧЫНА Ў НАЗВАХ СУЧАСНЫХ РАЁННЫХ ГАЗЕТ: УСТОЙЛІВЫ БРЭНД ЦІ ПЕРАЖЫТАК МІНУЛАГА?

Гісторыя раённага друку бярэ пачатак з 30-х гг. мінулага стагоддзя. Стварэнне новага тыпу перыядычных выданняў было прадугледжана пастановай ЦК УКП(б) ад 11 жніўня 1930 г. «Аб рэарганізацыі сеткі газет у сувязі з ліквідацыяй акруг». У дакуменце адзначалася, што «раёнка» павінна быць масавым палітычным органам з выразным вытворчым характарам [2, с. 8]. Аднак жыццё не стаіць на месцы, разам з развіццём грамадства развіваецца і друк як летапісец свайго часу. Калі раней, згодна з ленінскім прынцыпам, газета выступала ў якасці «калектыўнага прапагандыста, агітатара і арганізатара», сёння ў сувязі са змяненнем медыяіндустрыі сродкі масавай інфармацыі становяцца больш моцным сектарам бізнесу. На жаль, як паказвае практыка, не ўсе мясцовыя выданні ўлічваюць гэтую тэндэнцыю: час бывае зусім няўладны над пэўнымі асаблівасцямі рэгіянальных СМІ. У прыватнасці, назвы некаторых раённых газет, з’яўляючыся анахранізмамі, адсылаюць патэнцыяльнага чытача да часоў Савецкай дзяржавы, што негатыўна адбіваецца на іміджы сучаснага канкурэнтаздольнага выдання.

Ідэалагічна афарбаваную назву да гэтага часу маюць раённыя газеты «Савецкае Палессе» (Ганцавічы), «Да новых перамог» (Клецк), «Ударны фронт» (Шклоў), «Святло кастрычніка» (Мсціслаў), «Шлях кастрычніка» (Хоцімск), «Чырвоны прамень» (Чашнікі), «Савецкая вёска» (Дрыбін), «Сцяг Саветаў» (Клічаў), «Іскра» (Чавусы) і інш. Выкарыстанне такога тыпу нэймінгу сёння бачыцца немэтазгодным. Папершае, змяніўся лад жыцця грамадства, ідэалогія, стаўленне людзей да тых ці іншых каштоўнасцей. Па-другое, дзейнічаюць новыя прынцыпы камунікацыі: сучасная раённая газета – не баявы лісток прапаганды, а афіцыйнае грамадска-палітычнае выданне цэлага рэгіёна.